Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

DOI:10.17951/sb.2017.11.149
Studia Białorutenistyczne 11/2017 Literaturoznawstwo

Мікола Хаўстовіч / Mikałaj Chaustowicz

Uniwersytet Warszawski (Polska)
University of Warsaw (Poland)

e-mail: m.khaustovich@uw.edu.pl

Аляксандар Ельскі як перакладчык *Пана Тадэвуша* Адама Міцкевіча

Aleksander Jelski as the Translator of Adam Mickiewicz's „Pan Tadeusz"

Aleksander Jelski jako tłumacz „Pana Tadeusza" Adama Mickiewicza

Аляксандар Ельскі быў адным з тых, хто падрыхтаваў беларускае нацыянальнае адраджэнне канца XIX стагоддзя. Застаўшыся ў краі пасля паўстання 1863–1864 гг., менавіта ён стаў на чале даследаванняў беларускай гісторыі і літаратуры. Апублікаваўшы пад псеўданімамі Litwin obywatel і Bocian znad Ptyczy ў газеце Адама Кіркора "Kurjer Wileński" ў 1860–1862 гг. некалькі сваіх карэспандэнцый, А. Ельскі на пятнаццаць гадоў нібыта замаўкае: нічога не друкуе, хоць актыўна працуе, назапашвае матэрыял, вывучае духоўную і матэрыяльную культуру свае ўлюбёнае Міншчыны, Беларусі, а таксама іншых рэгіёнаў былое Рэчы Паспалітае.

А гэта былі часы, калі беларускія землі нагадвалі інтэлектуальную пустыню: каля 20 тысяч лепшых прадстаўнікоў народа высланы з краю, шмат хто паводле выракаў камісій палявога аўдытарыята трапіў пад нагляд паліцыі з забаронаю пакідаць "места постояннаго жительства", некаму ўдалося эміграваць. Адзін з гэтых эмігрантаў Адам Кіркор роспачна пісаў:

> Гэта былі апошнія намаганні[1], каб адрадзіць даўняе беларускае пісьменства дзеля захавання асобнае нацыі, і стараннi, каб не злілася яна з чужынцамі. Наша сумная гісторыя апошніх гадоў змяніла сутнасць справы. Ужо нельга спяваць песнярам і дударам беларускім. Беларус больш не ўбачыць сваіх твораў у друку. Не пачуе ён гукаў роднае мовы нават у касцёле. У школах – сёння шматлікіх – навучаюць па-расійску. Беларусь мусіць памерці;

[1] Раздзел *Literatura rusińska* ў кнізе *O literaturze pobratymczych narodów słowiańskich* А. Кіркор завяршае аповедам пра беларускіх літаратараў 1850-х гг. В. Дуніна-Марцінкевіча і А. Вярыгу-Дарэўскага.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

> як асобнае, адно з самых старэйшых славянскіх плямён, што з IX стагоддзя выступала пераважна ў гісторыі Літвы і Русі, яно памрэ ў сваёй нацыянальнай адметнасці. Можна было б пацешыцца думкаю, што хоць народ часта нібыта і не ведае гісторыі, аднак глыбока захоўвае яе ў сваім лоне. Але гэтую думку не ўдасца добра дастасаваць да беларусаў, бо кітайскі мур ужо аддзяляе масы люду ад краёвай інтэлігенцыі. Хутчэй можна пацешыцца іншаю прыгожаю думкаю, якую выказаў адзін з нашых гісторыкаў:[2] "Не счараваць лёс пячаткаю, не спавіць дух у пергамін" (Kirkor, 1874, s. 55).

"Маўчанне" А. Ельскага таксама, відаць, тлумачыцца ўсё тою ж роспаччу, адчаем, чаканнем, як ён называў, "сціхамір'я" – канца рэакцыі. Праўда, было ён губляў надзею, што "сціхамір'е" прыйдзе, і тады спрабаваў наладзіць дачыненні з рэдактарамі расійскіх выданняў. Напрыклад, у 1874 г. з рэдакцыяй часопіса "Вѣстникъ Европы" (Міхаілам Стасюлевічам) (BDAMLiM, 66–1–550–3). Вядома таксама, што А. Ельскі перакладаў з польскае мовы на расійскую працы філосафа, псіхолага і вынаходніка Юльяна Ахаровіча. Дзве з іх былі выдадзены ў Мінску ў 1876 і 1877 гг.; ён надрукаваў па-расійску ўласную працу *На сколько развитіе чувства состраданія къ животнымъ обезпечиваетъ нравственность человѣчества, его умственные и социальные интересы: Эскизъ изъ области педагогіи* (Мінск 1879).

І толькі напрыканцы 1870-х гг. заняўся больш адпаведнаю для сябе працаю. Атрымаўшы прапанову ад рэдактара *Słownika geograficznego Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich*, а таксама штотыднёвіка "Wędrowiec", Філіпа Сулімерскага (1843–1885), пачаў рыхтаваць, як сам называў, "манаграфіі" для гэтага шматтомнага выдання. Паводле слоў самога А. Ельскага, цягам дваццаці гадоў іх было апублікавана каля 10 тыс.

Супрацоўніцтва з варшаўскімі, львоўскімі, пазнанскімі і інш. рэдактарамі-выдаўцамі ўмацоўвае А. Ельскага ў ягонай польскасці. Асабліва тое, што яго шануюць, з ім лічацца, да яго звяртаюцца. Заўважым адначасна: умацаванне ў польскасці прыводзіць і да станаўлення ягонае "беларускасці". Найперш "беларускасць" А. Ельскага выявілася ў мясцовай праблематыцы ягоных допісаў-карэспандэнцый у пецярбургскую газету "Kraj", якая пачала выходзіць у 1882 г. Хутка ў коле супрацоўнікаў "Kraju" ён становіцца своеасаблівым экспертам у беларускім пытанні. Напрыклад, калі карэспандэнты газеты ўзнялі праблему "згладжвання ўсімі гаворкамі свае індывідуальнасці і падпадання ўплыву мовы культурнай, цывілізаванай", дык рэдакцыя звярнулася па каментар да "кампетэнтнейшага знаўцы беларускіх спраў п. Ельскага", які адгукнуўся вялікім аналітычным артыкулам *Пра беларускую гаворку* (*O gwarze białoruskiej*), надрукаваным у пятым і шостым нумарах "Kraju" за 1885 г. Грунтоўна аналізуючы матэрыял, А. Ельскі адназначна сцвярджае:

[2] Маюцца на ўвазе словы ("Ale nie zakląć losów pieczęcią, nie spowić ducha w pergamin") літаратара і гісторыка Караля Шайнохі (1818–1868) у "гістарычным апавяданні" пра Ядвігу і Ягайлу (у раздзеле пра Вітаўта), апублікаваным у Львове ў 1850-я гг. (1877, s. 132).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

> Беларуская мова можа быць спакойная за сваю будучыню і развівацца на ўласнай глебе, толькі б добрая грамадзянская воля аўтараў (маюцца на ўвазе літаратары, якія пішуць па-беларуску. – *М. Х.*) умела выказваць гэтай мовай усё высакароднае, прагрэсіўнае і карыснае. […] Таму выданне песень, гутарак, прыказак, казак, легенд беларускага народа, які паходзіць з старадаўніх крывічоў і дрыгавічоў, было б вельмі пажаданай справай, бо ў іх выяўляюцца рысы яго духоўных і бытавых асаблівасцяў (Jelski, 1885, s. 25).

І пасля, каб паказаць, наколькі беларуская мова здольная адлюстроўваць самую ўзнёслую паэзію, ён падае пачатак *Пана Тадэвуша* ў сваім – як пазней аказалася – перакладзе.

Вядома, А. Ельскі не быў адзіным, хто займаўся ў 1870–1880-я гг. беларускай праблематыкай[3]. Аднак менавіта ягоны даробак з'яўляецца тою асновай, на якой узнікла нацыянальнае адраджэнне ў 1890-я гг. Немалаважна і тое, што А. Ельскі стаўся тым звяном, якое лучыла папярэдні, дапаўстанцкі этап беларускага нацыянальнага руху з наступным. Гэта ён здолеў зберагчы слабенькі нацыянальны агеньчык, раздзьмуханы В. Дуніным-Марцінкевічам і А. Вярыгаю-Дарэўскім, каб перадаць яго наступнаму пакаленню. Бо дзякуючы свайму архіву і музею, сваім назапашаным ведам, не даў загінуць напрацаванаму.

Асабліва гэта відавочна ў справе ягоных дачыненняў з В. Дуніным-Марцінкевічам. Тут варта згадаць верш А. Ельскага *Вінцуку Дунін-Марцінкевічу, беларускаму поэту*, што быў напісаны ў 1872 г. Верш, у якім выяўляецца разуменне паэтам з фальварка Замосць каштоўнасці беларускае літаратуры; верш, у якім гучыць просьба даць новыя песні. А. Ельскі разумее, што патрэбныя песні (нават нягледзячы на тое, што яшчэ не прыйшло "сціхамір'е"), разумее, што патрэбны народны (нацыянальны) паэт, які будзе рабіць тое, што рабіў В. Дунін-Марцінкевіч. І нават дэкларуе: калі ты, В. Дунін-Марцінкевіч, не будзеш больш спяваць свае песні, дык я згодны замяніць цябе: "Бо калі будзеш ты маўчаць, – // Вазьму я дудачку іграць".

Цікава адзначыць і тое, што менавіта ён, А. Ельскі, стаўся прадаўжальнікам традыцый В. Дуніна-Марцінкевіча, бо добра разумеў значнасць зробленага Беларускім Дударом. А вось Ф. Багушэвіч напачатку ішоў іншым шляхам,

[3] Напрыклад, Еўдакім Раманаў (1855–1922), які з сярэдзіны 1870-х гг. стала займаўся вывучэннем беларускае этнаграфіі, пісаў у прадмове да пятага выпуску *Бѣлорусскаго сборника*: "Больно стало бѣлорусскому моему сердцу такое незнакомство ученыхъ съ моимъ роднымъ языкомъ, и, зная бѣдность литературы бѣлорусской, принялся я за собирательство" (Витебскъ 1891, с. III). Аднак, як прызнаецца ён сам, мэты ягонага "собирательства были филологическія". Г. зн., што Е. Раманаў працягваў "справу" П. Гільтэнбрандта, М. Дзмітрыева, П. Бяссонава і інш. як прадстаўнік расійскай навукі дзеля навукі. Ён займаецца "збіральніцтвам", бо ў Магілёўскай губерні "бѣлорусская речь уже исчезаетъ". Ягоная задача ў 1870–1880-я гг. – захаваць для навукі тое, што знікае. Праўда, сваёй багатай фактаграфіяй выданні Е. Раманава – фальклорныя і літаратурна-мастацкія – служылі надзейнай асновай беларускаму нацыянальнаму руху.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

шляхам адпрэчвання таго, што зрабілі папярэднікі. І знаходзіў абгрунтаванне сваёй канцэпцыі: "Здарывалася і мне чытаць і ксёнжачкі […] якогась пана Марцінкевіча, але ўсе як бы смеючыся з нашага брата пісаны" (1991, s. 65). Наратар Ф. Багушэвіча – паэт новы, сялянскі, які з сялянскай зацятасцю адкідае ўсё, асабліва не прыглядаючыся, што там было раней.

А вось А. Ельскі зусім інакш ставіцца да беларускай спадчыны: „Трэба ратаваць гаворку братоў-беларусаў шляхам збірання як этнаграфічнага, так і літаратурнага матэрыялу для больш шчаслівай будучыні" – піша ён Яну Карловічу. І сам актыўна ратуе: перапісвае, напрыклад, *Пінскую шляхту* В. Дуніна-Марцінкевіча, набывае дзясяткі (а можа, і сотні) беларускамоўных – аўтарскіх і ананімных – рукапісаў. Ды бераżліва захоўвае іх. Бо свята верыць, што

> свет знаходзіцца напярэдадні катаклізмаў, пасля якіх павінны прыйсці новыя грамадскія групоўкі. Ад гэтага паваротнага пункту пачнецца свабодны нацыянальны рух, дык і некалькімільённы беларускі народ разаўе свой дух у натуральным кірунку. Прыгадаем, у якіх фатальных акалічнасцях знаходзілася да нядаўняга часу чэшская мова: без літаратуры, амаль без мінулага і будучыні, а сёння! – зіхаціць сярод першарадных моў усяго свету і мае цудоўную, параўнальна, літаратуру і прэсу. […] нічога на месцы не стаіць вечна, а звычайна нават рэакцыя з'яўляецца вестуном энергічных імкненняў пры змене акалічнасцей.
>
> Як мне ясна бачыцца, і беларус, магчыма, прыйдзе да самасвядомасці. Маючы пастаянныя зносіны з гэтым народам, ведаючы наскрозь яго дух, я бачу з радасцю, як пры кожным свабодным выпадку наш селянін амаль інстынктыўна выказвае любоў да сваёй гаворкі. Таму ўжо ўдалося мне сустрэць некалькіх [чалавек] з вясковых школ, што пішуць зусім удалыя беларускія вершы, якія я рупліва збіраю ў надзеі, што Беларусь дачакаецца яшчэ свайго Шаўчэнкі. Ведаю, шаноўны пане, што калі б прачытаў вам некалькі раздзелаў *Пана Тадэвуша* ў сваім перакладзе, не вельмі б вы мяне зганілі, а можа, і Вястун Адам, калі б мог, зварухнуўся б у магіле ад радасці, бо яго цудоўная паэма толькі ў такой апратцы здолела б з карысцю завітаць у хаты нашых сялян, як таго жадаў неўміручы паэт. Не прымайце маіх слоў за пахвальбу, бо прызнаюся вам, што народ, калі я чытаю, разумее такога *Пана Тадэвуша* і слёзы стаяць у яго вачах…[4] Не, шаноўны пане, нельга сумнявацца, што яшчэ і Беларусь будзе жыць сваім духоўным жыццём і выпрацуе сваю «гаворку» да ступені «мовы» (za: Kisialou, 1977, s. 355).

[4] Прыкладна ў гэты час Юзаф Жукоўскі, паэт і землеўласнік з Рагачоўшчыны, пісаў да А. Ельскага: "Чуў я, што Пан распачаў перакладаць *Tadeusza* на нашую беларускую мову, а што пераклад будзе ўзорным, дык гэта больш чым пэўна: Пан цудоўна валодае беларускаю моваю. Адна толькі пры выданні гэтага твора можа сустрэць Пана неадольная цяжкасць – загадаюць пры друкаванні ўжываць альфабэту *гражданскаго*, альбо *кирылицы*, дык жадаючы ўнікнуць гэтага, выдаваць гэты манументальны твор трэба ў Кракаве ці Львове. Няхай Бог нам дапамагае і дасць Вам магчымасць споўніць Вашыя шляхетныя намеры. Панскі пераклад *Tadeusza* будзе сапраўдным, трывалым помнікам для нашага Вяшчуна, будуць яго чытаць у бедных мазанках нашыя беларусы, *usque ad finem* гэтага горача прагнуў наш Адам" (AGAD, 140_1, k. 181).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

Так пісаў А. Ельскі ў лісце да Я. Карловіча ад 16/28 лютага 1890 г. Аднак не трэба думаць, што дадзеныя разважанні з'явіліся адно як водгук на прачытанне зборніка *Беларускія паданні* Уладзіслава Вярыгі з прадмоваю Я. Карловіча. Падобныя думкі выказваў А. Ельскі яшчэ ў сярэдзіне 1880-х гг. у сваіх публікацыях у газеце "Kraj".

Цікава параўнаць допісы А. Ельскага і Ф. Багушэвіча ў пецярбургскую газету: у іх шмат агульнага: а менавіта – хроніка жыцця Міншчыны ў А. Ельскага і хроніка Віленшчыны ў Ф. Багушэвіча, але ёсць і адрознае: толькі А. Ельскі закранае ў сваіх публікацыях уласна беларускія пытанні: пытанні мовы, адукацыі і літаратуры. Як напіша у 1892 г. ён сам:

> Я горача выступаў як паплечнік і абаронца нашага люду ў справе ягонага вызвалення, ацверазення і адукацыі. Больш за трыццаць гадоў працуючы на полі публіцыстыкі, апублікаваў у разнастайных часопісах і адмысловых выданнях тысячы нататак па гэтай праблеме, сказаў братам-землеўласнікам шмат горкае праўды, выявіў не адну добрую рысу братоў нашых у сярмязе, ***абараняў з пачуццём сардэчнага спачування іхнюю духоўную спадчыну: гаворку, старыя звычаі, традыцыі*** – іхнія грамадскія і эканамічныя правы (Jelski, 1892, s. 14–15).

На нашу думку, без тэкстаў, апублікаваных А. Ельскім, не маглі нарадзіцца вядомыя словы Багушэвічавай прадмовы да *Дудкі беларускай*. Мы бачым наўпроставую залежнасць Ф. Багушэвіча ад А. Ельскага.

Цікава і тое, што словы, амаль ідэнтычныя выказаным Ф. Багушэвічам у прадмове да *Дудкі беларускай*, мы сустракаем і ў прадмове А. Ельскага да перакладу *Пана Тадэвуша*:

> Czytaja *Pana Tadèusza*, darahije Biełarusy, palubicia|ż ŭsim sercam swajù ròdnaju, zaniadbànaju, światuju biełaruskuju mowu, katoraja z pradwieku nia tolka byłà wàszaju u siołach, no jej używali sàmyje daŭniejszyje manarchi kraja i ich wialmoży. Wasz staradaŭny biełaruski jazỳk musić wart czahòś, kali można na jahò skład piaratłumaczyć najcalnejszyje paetycznyje utwory wialikich pisàcialej. Praz umiławannia swajhò jazykà, umiłujcie|ż i afiarawànaho Wam u biełaruskaj szacia *Pana Tadèusza*, u katoram żywie ŭsià bỳlina darahoha nam i Wam kraja. Kalì|b lubòŭ k'a|ŭsiamù ròdnamu razahreła sercy Biełarusaŭ, praz powieść, napisannuju gianialnym paetom dla swaìch i ŭsìch pabratymcaŭ, to duszà jahò, pragnùŭszaja tak silna toj ŭspulnaj zhody i lubwì, zasijała|b szczasciam aż na tom lepszam swiecia, a nasza bratniaja dola zakrasawałasia|b toża tut u ziamielcy rodnaj, bo tolka toj, chto umieje lubìć, wart u Boha ŭsiàkaho dabrà (Jelski, 1892, s. 4).

Праўда, пераклад А. Ельскага ўбачыў свет у 1892 г., і можна падумаць, што дадзеныя словы з'явіліся пасля прачытання *Дудкі беларускае*. Аднак мы ведаем, што кніжка Ф. Багушэвіча, завезеная самім аўтарам у ліпені 1891 г. у Кракаў (ён браў удзел у з'ездзе польскіх прыродазнаўцаў), была надрукаваная праз некалькі месяцаў – не пазней, чым у верасні (у верасні паэт пісаў Я. Карловічу: "карэктура

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

«жалейкі» вельмі няўдалая, процьма памылак" [1991, s. 218]). У той жа час мусім зазначыць: выяўлены ў AGAD чарнавік-рукапіс прадмовы А. Ельскага да *Пана Тадэвуша* датуецца 3 студзенем 1891 г., г. зн. падобныя выказванні, якія ўвайшлі ў прадмовы, нарадзіліся незалежна адно ад другога і, відаць, амаль адначасова.

Варта, вядома, звярнуць увагу і на тое, што прадмова А. Ельскага напісаная нібы "чалавекам збоку", "чужым панам", для якога "staradaŭny biełaruski jazyk" адно "ваш", не родны. А вось Ф. Багушэвіч, "пераапрануўшыся ў світку" Мацея Бурачка вядзе дыялог з чытачом-селянінам пра рэчы свойскія, свае. Аднак не забывайма, што трацячы на "свойскасці", словы А. Ельскага, "чужога", набывалі выключную значнасць і аўтарытэтнасць, бо звычайна ад чужых селянін чуў толькі выразы пагарды і абразы ў дачыненні да ягонае гаворкі; селяніна нязменна пераконвалі, што ягоная гаворка "цёмная" і "некультурная".

Ведаем мы таксама, што ў гэтым жа 1891 г. (магчыма, кастрычніку-лістападзе) А. Ельскі навязаў ліставанне з Ф. Багушэвічам. Апрача кароткае згадкі пра гэта ў лісце да Я. Карловіча, больш аніякай інфармацыі пра дачыненні двух найбольш значных дзеячаў у галіне беларушчыны таго часу не захавалася. Але і адно гэта сведчыць пра тое, што А. Ельскі ведае: Ф. Багушэвіч – беларускі паэт, а таму просіць аўтографы для сваіх збораў. Вядома, аўтографы літаратурных твораў, а не тых нататак, што друкаваліся ў газеце "Kraj". Зусім верагодна, менавіта ад аўтара атрымаў бібліёграф з фальварка Замосць асобнік *Дудкі беларускае*, каб уключыць яе апісанне-характарыстыку ў сваю працу, якая будзе надрукаваная ў VIII томе *Wielkiej encyklopedii powszechnej ilustrowanej* (Warszawa 1892):

> Выйшла ў 1891 г. у Кракаве ў друкарні Анчыца і суполкі важная кніжачка Мацея Бурачка (псеўданім) пад тытулам *Дудка беларуская* з празаічнаю прадмоваю пра святасць беларускае гаворкі для беларусаў. Гэта зборнік тэндэнцыйных вершыкаў пад рознымі тытуламі; іх разам з прадмоваю – 20 на 72 старонках малое васьмёркі. Шмат друкарскіх памылак, а мова не зусім тыповая, бо люду Дзісенскага і Вілейскага паветаў; найчысцейшая ж мова – пачаўшы ад Міншчыны ў бок Лепеля і Полацка. Ёсць у кніжцы Бурачка выдатныя вершы *Хрэсбіны Мацюка* і *Быў у Чысцы*. Змест першага датычыць пераследу веры, а другога – кары за грахі для паноў, ксяндзоў, чыноўнікаў і розных міраедаў (AGAD, 140_1, k. 532).

Рукапіс нататкі (а яна значна адрозніваецца ад таго, што было апублікаванае) можа сведчыць: А. Ельскі ведае, хто пісаў гэтую кніжку: згадаўшы Мацея Бурачка ён у дужках пазначае – псеўданім. Ды і характарыстыка зборніка, можна сказаць, прыяцельская, хоць заўвагі таксама ёсць. Заўважым, відаць, невыпадкова ў зборах А. Ельскага захавалася і рэпрадукцыя фотаздымка Ф. Багушэвіча.

Пераклад А. Ельскага першае кнігі *Пана Тадэвуша*, выдадзены ў Львове ў 1892 г., гісторыкі літаратуры ведалі, але не надавалі яму асаблівага значэння. Я. Карскі палічыў яго першым друкаваным творам А. Ельскага па-беларуску, а таксама даў кароткую характарыстыку:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

> Перевод Ельскаго *Пана Тадеуша*, безусловно, складнее и легче перевода Д.-Марцинкевича […] сразу бросается в глаза правильный ритм, что свойственно только тоническому размеру, составляющему принадлежность языков с разноместным ударением. Впрочем, хотя Ельский и хорошо был знаком с русской литературной речью (о чем можно судить по нередким отклонениям у него от белорусского наречия в сторону литературного русского языка), он все же не решился исключительно пользоваться тоническим стихом, и в рассматриваемом переводе неуклюжие силлабические стихи нередки (Karskij, 2007, s. 360).

М. Гарэцкі адно назваў пераклад А. Ельскага сярод чатырох "ведамых" рэчаў ягонага "беларускага пісьменства" (1921, s. 101). А вось навукоўцы 1920-х – 1950-х гг. ледзь не цалкам ігнаравалі даробак літаратара XIX ст.: яго творам не было месца ні ў хрэстаматыях, ні літаратуразнаўчых даследаваннях. Як выключэнне, праца дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларускай ССР В. Барысенкі, дзе творы А. Ельскага пералічваліся.

З сярэдзіны 1960-х гг. зрэдчас пра пераклад А. Ельскага літаратуразнаўцы згадвалі, а ўкладальнікі хрэстаматый падавалі фрагменты з яго (Aleksandrowicz, Łojka, Rahojsza, 1971, s. 323–327; Łojka, Rahojsza, 1988, s. 421–423). Урэшце ў томе *Выбранае* апублікаваны увесь тэкст перакладу, хоць рэдактары дазволілі сабе унесці пэўныя змены (Jelski, 2004, s. 388–414).

Даследаванні асаблівасцяў перакладу *Пана Тадэвуша* з'явіліся на пачатку 1980-х гадоў. Праўда, у адрозненне ад Я. Карскага, Зофія Скібінская-Харыла не заўважыла аніякіх вартасцяў перакладу А. Ельскага:

> Гэтае "амаль даслоўна", раскрывае сам метад новага беларускага перакладу паэмы, метад буквалісцкі, мала творчы, механічны. Тэндэнцыя даслоўнасці не дала ў выніку мастацкага эфекту. У перакладчыка запанавала толькі парафраза, грубае парушэнне сэнсу арыгінала, прыблізнасць […] Імкнучыся перадаць кожнае слова арыгінала, А. Ельскі часта губляў рытм, дух міцкевічаўскага верша, пазбаўляючы яго вобразнасці і маляўнічасці, зводзячы верш на нізкі бытавы тон, выяўляючы сябе перакладчыкам без развітага эстэтычнага густу. […] Пераклад А. Ельскага на многа ніжэй перакладу Дуніна-Марцінкевіча, хаця і быў зроблены на больш чым 30 год пазней марцінкевічавага, калі беларуская літаратура шмат ужо чым ўзбагацілася (Skibinska-Charyła, 1982, s. 83–84).

Думаецца, ацэнка перакладу А. Ельскага наўпрост залежала ад беларускіх публікацый 1950-х гг.: польская даследчыца знаходзілася ў палоне пэўных стэрэатыпаў пра рэакцыйны характар творчасці пісьменніка і перакладчыка. Цікава, што Антаніна Абрэмбска-Яблоньска называе дадзеную працу адно "спробаю ацэнкі" беларускіх перакладаў *Пана Тадэвуша* (1984, s. IX).

Пераклад А. Ельскага – гэта гістарычны дакумент, помнік беларускае мовы другое паловы XIX ст. Мовы, якой карысталася не толькі сялянства, але і значная частка адукаванага насельніцтва краю. Аб'ектыўная ацэнка перакладчыцкае працы А. Ельскага яшчэ наперадзе.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

Не высветленыя таксама акалічнасці, як ішла праца над перакладам, а таксама друкаванне першае кнігі *Пана Тадэвуша*. А такія магчымасці былі, бо сярод папераў А. Ельскага ў AGAD захавалася некалькі рукапісных картак, якія крышку прыўзнімаюць заслону над гэтай таямніцай. Усяго дакументаў сем: 1). Чарнавік прадмовы да выдання *Słaŭco ad tłumacza* (адрозніваецца ад апублікаванага тэксту толькі адным словам: "sercam celym" заменена ў канчатковым варыянце на "ŭsim sercam". У рукапісе ёсць дата, відавочна, напісання прадмовы – "1891 r. 2 stycznia" (AGAD, 140_1, k. 179); 2). Першы варыянт прысвячэння *Pracu hetu ad szczyraho serca afiaruja tłumacz na pażynak, bratniamu biełaruskanu narodu…*, дзе шмат правак (AGAD, 140_1, k. 174); 3). Чарнавік зместу першае кнігі *Pajaśniennia reczy pierszaj knihi* з дапіскаю на палях "petytem drukować" (AGAD, 140_1, k. 175); 4). Відавочна, чарнавік просьбы-рэкамендацыі выдаўцу: *Uwagi dla wydawcy Pana Tadeusza w białoruskiej szacie* (гл. ніжэй); 5). Адрас доктара Каліны (гл. ніжэй); 6). Чарнавік (рабочая версія) тытульнае старонкі кнігі: *Pan Tadeusz. Kniha I. Paemat Adama Mickiewicza, piarałažyŭ z polskaho na biełaruski jazyk i achwiarawaŭ dobramu, bratniamu biełaruskamu narodu Alaksandra Jelski* (у канчатковым варыянце – A. J.), на якім унізе злева і справа дробнымі літарамі занатаваныя важныя інфармацыі. Злева: "Tekst doręczono (*неразб.*)[5] 1891 r. 3 stycznia", а справа: "Zacząłem 10 czerwca 1889 r. Daj Boże skończyć!" (AGAD, 140_1, k. 179); 7). Канчатковы варыянт прысвячэння *Pracu hetu afiaruja tłumacz ad szczyraho serca, na pażynak, bratniamu biełaruskanu narodu*… з дапіскам на палях: "Tę dedykację drukować wielkimi literami" (AGAD, 140_1, k. 167–170) (AGAD, 140_1, k. 183).

З дадзеных дакументаў вынікае, што А. Ельскі лічыў пачаткам працы над перакладам *Пана Тадэвуша* дзень 10 чэрвеня 1889 г., хоць ужо ў 1885 г. ён апублікаваў пераклад 22-х пачатковых радкоў твора А. Міцкевіча ў сваім артыкуле *Пра беларускую гаворку* (1885, nr 6, s. 25). Трэба думаць, што да пачатку студзеня 1891 г. пераклад першае кнігі быў завершаны. Да гэтага часу, А. Ельскі, відаць, ужо ведаў, дзе будзе друкавацца ягоная праца. Пра гэта сведчыць занатаваны перакладчыкам адрас доктара Антоні Каліны (1846–1906), вядомага польскага славіста і этнографа, які з 1877 г. жыў і працаваў у Львове (з 1888 г. – прафесар кафедры славістыкі ўніверсітэту): "Adres Dr Kaliny. Австрія, Галиція. Лембергъ.[6] Lwów. JWielmożny Dr Kalina. Ul. Gancarska № 15" (AGAD, 140_1, k. 178).

Думаецца, менавіта А. Каліна павінен быў заняцца выданнем беларускага перакладу славутага твора А. Міцкевіча[7]; менавіта цікавасцю навукоўца да маладаследаваных славянскіх моваў (кашубскай, палабскай) і можна патлумачыць ягонае жаданне дапамагчы А. Ельскаму, які прапанаваў тэкст на малавядомай

[5] Прозвішча, магчыма, пачынаецца як Ladus…

[6] Нямецкая назва горада Львоў.

[7] Пацвярджэннем могуць быць лісты Вацлава Іваноўскага да А. Ельскага (гл. ніжэй).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

у навуковым свеце беларускай мове. Львоўскі дабрадзей беларускага літаратара з Міншчыны мусіў знайсці выдаўцá, бо А. Ельскі адно ў адмысловых *Заўвагах для выдаўца* выклаў сваё бачанне тэхнічнага боку справы:

Заўвагі для выдаўца *Пана Тадэвуша* ў беларускай шаце

1. Фармат павінен быць сярэдні, адпаведны дзеля дастаткова доўгага радка і вялікага шрыфту[8].
2. Шрыфт павінен быць вялікі і выразны, званы ў друкароў Cicero.[9] Папера добрая, шчыльная.
3. Карэктура павінна быць зроблена як найлепш з захаваннем беларускае акцэнтацыі над галоснымі, а менавіта знакі: ̀, які абазначае падаўжэнне голасу, націск і ̆, які абазначае скарачэнне голасу гучання літары ***и***, напрыклад, maŭczy, ŭłaśniaż, biarỳ, zachaciėŭ і г. д.
4. Нават калі ў тэксце рукапісу няма акцэнтацыі з-за спешнасці пісання, яна павінна быць захаваная ў друку[10] дзеля лягчэйшага чытання, асабліва тымі, хто, не ведаючы добра беларушчыны, можа ставіць націск няправільна і скажаць характар мовы.
5. У разе хоць якое няпэўнасці – звяртацца лістоўна да перакладчыка за ягоны кошт.
6. Асобнікаў можа быць блізу 300–400.
7. Кніжка павінна быць адразу добра сшытая і абрэзаная і тым самым даступная дзеля чытання; а з тае прычыны, што няшмат будзе мець тэксту (*неразб.*), дык варта друкаваць дастаткова шырока, каб кніжка больш салідна выглядала і была больш прыемнаю ў чытанні.
8. Трэба захоўваць дыскрэтнасць.
9. З рукапісам абыходзіцца як найашчадней, каб не загінуў і не быў пашкоджаны, бо гэта важная праца.
10. Калі б знайшоўся выдавец, то аддаць яму з умоваю, што дасць мне 30 асобнікаў (AGAD, 140_1, k. 176–177).

Дадзеныя заўвагі могуць, хіба, сведчыць, што пошукам фінансавання выдання займаўся А. Каліна. Перадусім, няма тут гаворкі пра "самафінансаванне"; таксама немалаважны і той факт, што ў якасці ганарара за сваю працу А. Ельскі просіць 30 асобнікаў кніжкі. Звернем увагу: выдавец у асноўным выканаў просьбы-патрабаванні А. Ельскага (а быў ім Станіслаў Байлі, рэдактар часопіса "Gorzelnik" і кіраўнік "Народнай друкарні" ў Львове, што выдавала танныя кніжкі для народа).

[8] Тут і далей у артыкуле падкрэсленні чырвоным алоўкам А. Ельскага.

[9] Гаворка пра вышыню літары. Адпавядае 12 тыпаграфічным пунктам альбо прыкладна 4,5 мм.

[10] Відавочна, асоба, якая займалася выданнем, павінна была валодаць беларускаю моваю.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

Пэўна, выдаць *Пана Тадэвуша* ўдалося толькі ў наступным 1892 г. І год, пазначаны на вокладцы томіка, адпавядае рэальнаму выхаду яго ў свет[11].

Як цяпер стала вядома (дзякуючы лістам Вацлава Іваноўскага да А. Ельскага [AGAD, 140_2, k. 174–176, 179–180, 183–184]), фінансавала выданне кніжкі асветніцкае таварыства "Macierz Polska", заснаванае ў 1882 г. у Львове дзеля пашырэння адукацыі сярод люду. Трэба сказаць, што кіраўніцтва "Macierzy Polskiej" мела пэўныя сімпатыі да *Пана Тадэвуша* А. Міцкевіча: цягам чвэрці стагоддзя, дзякуючы гэтаму таварыству ўбачыла свет амаль 200 тыс. асобнікаў твораў. У тым ліку і пераклад А. Ельскага. Тлумачыцца гэта шэрагам акалічнасцяў. Напрыклад, урачыстым перанясеннем у ліпені 1890 г. астанкаў А. Міцкевіча на Вавель, а таксама тым, што адным з заснавальнікаў "Macierzy Polskiej" быў Уладзіслаў Бэлза, паэт і даследчык творчасці А. Міцкевіча (у 1892 г. выдаў манаграфію *Adam Mickiewicz: życie i dzieła: książka zbiorowa*). Наклад беларускага выдання *Пана Тадэвуша* быў, відаць, даволі вялікі: яшчэ ў 1905–1906 гг. В. Іваноўскі набыў у А. Каліны для "пецярбургскага складу" некалькі дзясяткаў асобнікаў і прасіў, каб "z jakuju tysiaczu addaŭ na skład da „Ksionżki" Krakaŭ – Grodzka № 50" (AGAD, 140_2, k. 179), бо ў Кракаве "hłaŭny skład *Dudki*, *Smyka*, […] *Пес'ни* […] niachaj i *Pan Tadeusz* byŭ by u kampanii" (AGAD, 140_2, k. 175).

Здаецца, гісторыкі літаратуры не спрабавалі вызначыць польскамоўнае выданне *Пана Тадэвуша*, паводле якога зроблены пераклад. Справа ў тым, што ў XIX с. тэкст паэмы А. Міцкевіча часам друкаваўся ў "адметнай" рэдакцыі, якая адрозніваецца ад таго "класічнага" тэксту, які мы добра ведаем. Што цікава: у перакладзе В. Дуніна-Марцінкевіча, а таксама ў перакладзе А. Ельскага захаваліся асаблівасці "адметнай" рэдакцыі, што дазваляе сцвярджаць: абодва перакладчыкі карысталіся адным друкаваным тэкстам. У выпадку з В. Дуніным-Марцінкевічам вызначыць гэтае выданне нескладана: па-першае, да 1859 г. выданняў *Пана Тадэвуша* было няшмат, а па-другое, парыжскія томікі *Пана Тадэвуша* былі, відавочна, вельмі рэдкія на тэрыторыі Расійскае імперыі[12]. А таму лагічна дапусціць, што "беларускі дудар" карыстаўся выдадзеным Самуэлем Генрыкам Межбахам у Варшаве ў 1858 г. (пасля 20 лютага) трэцім і чацвёрым томікамі васьмітомніка *Творы Адама Міцкевіча* (1858), у якіх друкаваўся *Пан Тадэвуш*. Параўнальны аналіз выдання С. Г. Межбаха і перакладу В. Дуніна-Марцінкевіча пацвярджае нашае дапушчэнне.

В. Дуніна-Марцінкевіча, бясспрэчна, магла зацікавіць прадмова С. Г. Межбаха, у якой выдавец сцвярджаў, што ягонае выданне самае дакладнае і правільнае з усіх ранейшых:

[11] У асобных беларускіх публікацыях год выдання часам неаргументавана падаецца ці то як 1891, ці то як 1893.

[12] У 1834 г. у Парыжы выйшла выданне Аляксандра Елавецкага ў двух тамах, пасля паўторанае ў зборы твораў паэта ў гэтым жа 1834 г., а таксама ў 1838 г. У 1844 г. паэму надрукаваў Яўстах Янушкевіч. Торуньскае выданне 1858–1859 г. Эрнста Ламбека паўтарала слова ў слова папярэдняе. (Вядома, што Э. Ламбек (Ernest Georg Maximilian Lambeck, 1814–1892) без дазволу спадкаемцаў яшчэ двойчы (у 1865 і 1878 гг.) выдаў *Пана Тадэвуша* ў поўным аб'ёме).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

> У выданнях аповесці *Пан Тадэвуш*, а галоўнае – у апошнім, надрукаваным у Парыжы ў 1844 г., маецца шмат памылак і прапушчаных радкоў, адсутнасць якіх была заўважальнаю. П[ан] Я. Янушкевіч, даведаўшыся пра нашае выданне, меў ласку даслаць нам праўкі гэтых памылак і прапушчаныя радкі з свайго асобніка *Пана Тадэвуша*, у якім уласнаручна сам бяссмяротны вяшчун адны паправіў, іншыя дапісаў (ліст з Парыжа ад 20 студзеня 1858 г.). Усё гэта чытач знойдзе ў нашым выданні. Апрача гэтага, ва ўласнаручным асобніку А. Міцкевіча *Пана Тадэвуша* маюцца неапублікаваныя дасюль фрагменты, якія служаць папаўненню цэласці, а таксама дастаткова вялікія варыянты. Так, напр., апісання літоўскае пушчы апрача [асноўнага] тэксту, ёсць два варыянты. Яны былі прапушчаныя ў папярэдніх выданнях гэтае аповесці альбо з-за таго, што аўтар замяніў іх іншымі, альбо рады быў з некаторых з іх зрабіць ахвяраванне агню дзеля сваіх сяброў, а асабліва дзеля с. п. Стэфана Вітвіцкага, няўмольнага пурыста. У нашым жа выданні дапаўненні аўтара, якія ён уласнаю рукою пакінуў у тэксце, мы падаём у ім, пазначаючы кожны фрагмент зорачкамі, а варыянты змяшчаем у канцы кожнае кнігі (Merzbach, 1858, s. I–II).

Пішучы сваю прадмову, С. Г. Межбах, відавочна, яшчэ не ведаў, што варшаўскі цэнзар Францішак Сабешчанскі выкрэсліць з ягонага выдання *Пана Тадэвуша* амаль 400 радкоў. А таму ў перакладзе В. Дуніна-Марцінкевіча (а пасля і А. Ельскага) няма, напрыклад, “характарыстык і дзеянняў” Тадэвуша Касцюшкі:

> Takim był, gdy przysięgał na stopniach ołtarzów,
> Że tym mieczem wypędzi z Polski trzech mocarzów,
> Albo sam na nim padnie,

і Якуба Ясінскага:

> Stoją na szańcach Pragi, na stosach Moskali,
> Siekąc wrogów, a Praga już się wkoło pali.

Ці ведалі пра “цэнзурныя нажніцы” беларускія перакладчыкі? В. Дунін-Марцінкевіч – хутчэй за ўсё – не. А вось А. Ельскі – дакладна ведаў, бо меў у сваёй бібліятэцы іншыя выданні *Пана Тадэвуша*. Тым не менш, ён перакладае “паводле С. Г. Межбаха”, бо дапускаў магчымыя рэпрэсіі ў дачыненні да ягонага выдання, якое прызначалася не для замежнага чытача, а для беларускіх сялян.

Пацвярджаюць той факт, што А. Ельскі карыстаўся варшаўскім выданнем 1858 г., два фрагменты першае кнігі твора А. Міцкевіча, якіх няма ў асноўным тэксце большасці іншых выданняў:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

Tadeusz przypomniał: jak wszedł do komnaty,
Pustéj jak to siedzenie, i patrzał przez kwiaty,
Jak przez głowy sąsiadek, patrzał w okna sadu,
Jak teraz we drzwi sieni. Szukał znowu śladu,
Pamiątki, zostawionéj po prześlicznéj nóżce,
Co głębiéj w myśli tkwiła niż w piasku na dróżce.
I nie śmiał oczu podnieść do góry: był pewny,
Że ujrzy na filarze jéj ubior powiewny,
Włos pokręcony, w białe obwinięty strączki,
I na piersiach odkrytych skryżowane rączki.[13]

Prypòmnilaś Tadèuszu: ŭszescja da kamnaty
Paròżnaj jak toja siadzennia; cikawannia praz kwiaty
Jak praz hòławy sasiedak; razhladannia u wokny sadkù,
Jak ciapièr u dzwiery sieni. Szukàŭ jon znoŭ śladkŭ
Pàmiatki paŭstałaj pa toj pieknaj nożcy,
Katòraja hłybiej u mysli sieła czym u piaskù na darożcy.
I nia śmieŭ padniàć waczèj u horu, bo byŭ peŭny,
Szto ubaczyć na filary jej prybòr pawieŭny,
Wołas skrùczany, u biełyja struczkì paabwiwany,
I na hrudziàch atkrytych ruczki skryżawany.

Іншым было ў С. Г. Межбаха і завяршэнне першае кнігі *Пана Тадэвуша*:

Teraz, gdy wszyscy spali, w Sędziego komorze
Gadał długo. Wychodząc, ostrzegł że nie może
Być na mszy obławniczéj: bo jutro, w niedzielę,
Musi w parafialnym nauczać kościele;
Potém będzie powrotu strzelców w karczmie czekał,
Lub, gdy prędko nie wrócą, szukać ich przyrzekał.[14]

Ciapièr jak ŭsiè spali, k'sudzjì pajcì moh
I doŭha żupìŭ. Wychòdziaczy aściaròh
Szto nia budzia na mszy abłaŭnaj, bo zaŭtra niadziela
I jon musić u parafialnam nauczàć kasciela,
No budzia pawarotu strałcòŭ u karczmiè czakàć
A jak skora nia wièrnucca, pryrok ich szukàć.

Усё гэта трэба ўлічваць, даследуючы праблему эквілініарнасці і эквірытмічнасці перакладу А. Ельскага.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што публіцыстычная дзейнасць А. Ельскага, ягоны пераклад першае кнігі *Пана Тадэвуша* сведчаць, што ён быў лідарам тагачаснага беларускага нацыянальнага адраджэння, сваімі публікацыямі стварыўшы тую базу, на якой напачатку XX ст. узнікла нашаніўства. Невыпадкова і Б. Эпімах-Шыпіла, і М. Доўнар-Запольскі, і В. Іваноўскі зрабілі свае першыя крокі ў бок беларушчыны, абапіраючыся на даробак *Pana Szanawanaha* з фальварка Замосць.

[13] У перакладзе А. Ельскага – гэта радкі 325–334, а В. Дуніна-Марцінкевіча – 337–344.
[14] У перакладзе А. Ельскага – гэта радкі 991–996, а В. Дуніна-Марцінкевіча – 977–981.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

Bibliografia

Źródła

AGAD, 140_1: *Materyały bibliograficzne z zakresu literatury białoruskiej uzbierane przez Al. Jelskiego*.

AGAD, 140_2: *Materyały bibliograficzne z zakresu literatury białoruskiej uzbierane przez Al. Jelskiego.*

Aleksandrowicz, Sciapan, Łojka, Aleh, Rahojsza, Wiaczasłau. (1971). *Biełaruskaja litaratura XIX st.: Chrestamatyja*. Minsk: Mastackaja litaratura.

Bahuszewicz, Franciszak. (1991). *Twory*. Mińsk: Mastackaja litaratura.

BDAMLiM, 66–1–550.

Jelski, Aleksander. (1885). O gwarze białoruskiej. *Kraj*, 5–6.

Jelski, Aleksander. (1892). Listy z prowincji: Mińska gub., 13 lutego [Polemika z „Mińskim listkom"]. *Kraj*, 9.

J[elski], A[leksander]. Pierakład. (1892). *Pan Tadeusz: Paemat Adama Mickiewicza*, kniha I, Lwou: Druk lud. pod upr. St. Baylaho.

Jelski, Alaksandr. (2004). *Wybranaje*. Minsk: Biełaruski knihazbor.

Kirkor, Adam. (1874). *O literaturze pobratymczych narodów słowiańskich: odczyty publiczne w Muzeum Techniczno-Przemysłowem w Krakowie*. Kraków.

Łojka, Aleh, Rahojsza Wiaczasłau. (1988). *Biełaruskaja litaratura XIX st.: Chrestamatyja*. Minsk: Mastackaja litaratura.

Szajnocha, Karol. (1877). *Dzieła*. T. VII: *Jadwiga i Jagiełło*. Warszawa.

Kisialou, Hienadź (ukł.). (1977). *Paczynalniki: Z historyka-litaraturnych materyjałau XIX st.* Minsk: Biełaruskaja nawuka.

Merzbach, Samuel Henryk. (1858). *Wstęp*. W: *Pisma Adama Mickiewicza, wydanie nowe, znacznie powiększone, z portretem autora i ośmią rycinami na stali*. T. III–IV. Warszawa: nakładem S. H. Merzbacha Księgarza, w Poznaniu u Ludwika Merzbacha.

Opracowania

Harecki, Maksim. (1921). *Historyja biełaruskaje literatury*. Wilnia: Wilenskaje wydawiectwa B. Kleckina.

Karskij, Efim. (2007). *Biełorusy, w 3 tomach, t. 3, kn. 2: Oczerki slowiesnosti biełorusskago plemieni*. Minsk: Biełaruskaja nawuka.

Obrębska-Jabłońska, Antonina. (1984). *Wstęp z komentarzem językowym do przekładu Bronisława Taraszkiewicza*. W: Adam Mickiewicz. *Pan Tadewusz, albo Aposzni zajezd na Litwie* (s. IX–LVI). Pierakład Branisława Taraszkiewicza. Olsztyn: Pojezierze.

Skibinska-Charyła, Zofia. (1982). *Pan Tadewusz* Adama Mickiewicza u pierakładach na biełaruskuju mowu. W: *Most praz stahoddzi – Most przez wieki* (s. 81–94). Biełastok.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:53:41

Summary

This article presents a new interpretation of Aleksander Jelski's role in the Belarusian national renaissance at the end of the 19th century. It also claims Jelski's works to be the base of the "Nasha Niva" phenomenon. His translation of the first book of Adam Mickiewicz's Pan Tadeusz is especially important. Materials found in archives have allowed us to include documentation of the translation's publishing process into our study.

Key words: Aleksander Jelski, national renaissance, Adam Mickiewicz's *Pan Tadeusz*

Streszczenie

W artykule została podjęta próba przemyślenia roli Aleksandra Jelskiego w białoruskim odrodzeniu narodowym z końca XIX w. Autor wskazuje również, że prace Jelskiego stały się fundamentem, na którym wyrosła „naszaniustwa". Szczególne znaczenie wśród jego prac miało tłumaczenie pierwszej księgi *Pana Tadeusza* Adama Mickiewicza. Znalezione materiały archiwalne pozwoliły przedstawić informacje o przygotowaniu tłumaczenia do druku.

Słowa kluczowe: Aleksander Jelski, odrodzenie narodowe, *Pan Tadeusz* Adama Mickiewicza

Рэзюме

У артыкуле робіцца спроба пераасэнсавання ролі Аляксандра Ельскага ў беларускім нацыянальным адраджэнні канца XIX ст.; сцвярджаецца таксама, што працы А. Ельскага сталі той базай, на аснове якой узнікла "нашаніўства". Асаблівае значэнне сярод гэтых прац меў пераклад першае кнігі *Пана Тадэвуша* А. Міцкевіча. Выяўленыя архіўныя матэрыялы дазволілі ўвесці ў навуковы ўжытак звесткі адносна падрыхтоўкі перакладу да выдання.

Ключавыя словы: Аляксандр Ельскі, беларускае нацыянальнае адраджэнне, *Пан Тадэвуш* Адама Міцкевіча